Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Ляхавічах да калоніі і "хіміі" асудзілі бацьку і сына за расклейванне ўлётак з абразай Лукашэнкі

28.10.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, дыфамацыя



Судовая зала. Ілюстрацыйнае фота spring96.org

У судзе Ляхавіцкага раёна 27 кастрычніка вынеслі прысуд Генадзю і Вячаславу Смірновым, якіх вінавацілі ў абразе Лукашэнкі (ч. 1 арт. 368 Крымінальнага кодэкса), а Генадзя — яшчэ і ў супраціве супрацоўніку органаў унутраных спраў (ч. 2 арт. 363 Крымінальнага кодекса).

Справу разглядала суддзя **Таццяна Жарко**, бок дзяржабвінавачання прадстаўляла **Дзіяна Клімовіч**. Пацярпелым па справе быў прызнаны міліцыянер-кіроўца Ляхавіцкага РАУС **Аляксандр Болтуць**.

Паводле абвінавачвання, **Генадзь Смірноў**, маючы адзіны намер на знявагу гонару і годнасці А. Р. Лукашэнкі, набыў у нявызначаным месцы і ў нявызначаны час улёткі дэструктыўнага характару, пасля чаго 15 сакавіка 2021 года ў перыяд часу з 20.00 да 23.30 гадзін, дзейнічаючы групай асобаў па

папярэдняй змове з сынам **Вячаславам Смірновым**, наўмысна, выказваючы адкрытую праяву непрыязнасці, размясціў улёткі з партрэтам Лукашэнкі і друкаваным тэкстам, якія змяшчалі негатыўную ацэнку ў адрас апошняга, на дошцы аб'яваў аўтобуснага прыпынку, на трансфарматарнай падстанцыі каля Ляхавіцкага райвыканкама і на металічнай апоры вулічнага асвятлення каля дома па вул. Гагарына, 9. На ўлётках змяшчаўся тэкст *"Адольф Григорьевич Лукашенко"* і *"Нам нужен труп в одежде короля, а не живой придурок у руля"*, які быў кваліфікаваны як абраза прэзідэнта, а дзеянні абвінавачваных — паводле ч. 1 арт. 368 КК.

Увечары 3 жніўня 2021 года Генадзь Смірноў, знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення на тэрыторыі парку непадалёк ад памятнага знака "Фартэцыя", падчас яго затрымання за здзяйсненне адміністрацыйных правапарушэнняў паводле ч. 1 арт. 19.3 і ч. 1 арт. 24.23 КаАП для дастаўлення ў РАУС аказаў супраціў, спалучаны з ужываннем гвалту, супрацоўніку міліцыі Аляксандру Болтуцю пры выкананні ім абавязкаў па ахове грамадскага парадку і спыненні адміністрацыйных правапарушэнняў: абвінавачаны ўпіраўся, спрабаваў вырвацца падчас затрымання, а таксама нанёс удар галавой і ўдар нагой у вобласць галавы пацярпеламу, якія прыйшліся па надзетым на ім ахоўным шлеме. Такім чынам Генадзь Смірноў здзейсніў злачынства, адказнасць за якое прадугледжаная ч. 2 арт. 363 Крымінальнага кодэкса.

Генадзь Смірноў віну па абвінавачванні ў абразе прэзідэнта не прызнаў, а па абвінавачванні ў супраціве супрацоўніку міліцыі — прызнаў часткова. Вячаслаў Смірноў сваёй віны не прызнаў. На першым пасяджэнні ў абвінавачаных не было абаронцаў.

Падчас ператрусу дома ў Смірнова былі знойдзеныя ў кішэні курткі налепкі, якія, паводле абвінавачанага, Генадзь знайшоў раней на лаўцы ў горадзе. Падчас следства Генадзь адмаўляўся ад дачы паказанняў, не апазнаў ні сябе, ні сына на відэазапісах з камер назірання.

3 жніўня Генадзь Смірноў са знаёмым выпіў піва, пасля пайшлі ў горад з бела-чырвона-белымі сцягамі, завязанымі на спіне. На пытанне пракурора, навошта абвінавачваны ўзяў з сабой сцяг, ён адказаў:

> *"Калі выходзілі проста, то атрымлівалі проста так па 40 базавых, дык каб было хоць за што атрымліваць, хоць за сцяг"*.

Знаходзіліся побач з "Фартэцыяй" каля 15 хвілінаў, калі да Смірнова з таварышам падышлі два супрацоўнікі міліцыі і прапанавалі прайсці ў аддзяленне дзеля высветлення асобы. Генадзь адмовіўся, візуальна ведаў міліцыянераў. Раней мужчыну тройчы прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці за ўдзел у несанкцыянаваных мерапрыемствах. І ў той раз — 3 жніўня — мужчына не хацеў ехаць, бо *"колькі можна ўжо ездзіць"*. Пасля гэтага абвінавачанаму пачалі заломваць рукі, ён адмахваўся і стукнуў галавой аб шлем міліцыянера-кіроўцу, нямоцна. Калі Генадзя ўжо паклалі на зямлю, падышлі яшчэ два супрацоўнікі, сталі "ламаць рукі і ногі", тады абвінавачваны ад болю проста адмахнуўся нагой і не бачыў нават, куды патрапіў.

> *"Я проста сядзеў на лаўцы, гэтым разам са сцягам, пад якім прымаў прысягу. Я не лічу, што парушыў закон. І за гэта мне можна рукі ламаць і ногі выкручваць?"*

Генадзь не пярэчыў, што адмаўляўся прайсці ў Ляхавіцкае РУУС, але наўмысна гвалту не прычыняў.

На пытанне пракурора, ці выказваў раней Смірноў сваю пазіцыю і стаўленне да дзейснай улады, Генадзь сказаў:

> *"Я ніколі не займаўся палітыкай. Я выйшаў пасля 9 жніўня, калі пачаўся гэты бязлад і пачалі біць людзей, таму што ў мяне дачка магла патрапіць пад гэта. Забралі яе аднакурсніка на вуліцы проста так, чатыры дні не ведалі, дзе дзіця, трэнера забралі. Я выйшаў за будучыню сваіх дзяцей! Каб такога не было ў 21-м стагоддзі ў цэнтры Еўропы, каб людзі хадзілі мірна і спакойна. Вось за гэта я выйшаў, а палітыкай я ніколі не займаўся".*

Пракурор: *Якія-небудзь каментары адносна дзейснай улады пакідалі дзесьці?*

Генадзь Смірноў: *А хто сказаў, што яна дзейсная? Хто яе выбіраў? Дзе законныя выбары?*

Далей у судзе дапыталі Вячаслава Смірнова, які сказаў, што нічога не рабіў, злачынства не здзяйсняў. Дома не бачыў ніякіх улётак, растлумачыць наконт іх канфіскацыі падчас ператрусу нічога не мог. Бачыў толькі бела-чырвона-белыя налепкі на лядоўні за дзень-два да затрымання, якія бацька знайшоў: яны яму спадабаліся, і ён наклеіў іх на лядоўню. Ніякіх іншых налепак не бачыў, сам нічога не ляпіў, убачыў фатаграфіі ўлётак толькі ў матэрыялах справы.

15 сакавіка адзначалі дзень народзінаў сястры з бацькам, былі дома, можа быць сам выходзіў у краму хвілін на 10-15, але дакладна ўжо не памятаў, пасля знаходзіўся дома. Таксама не пазнае па сілуэтах на скрыншотах з відэазапісаў ні сябе, ні бацьку. Канфіскаваныя прадметы адзення абвінавачваных падобныя да таго адзення, у якім невядомыя ляпілі налепкі і былі зафіксаваныя камерамі назірання.

Вячаслаў Смірноў заявіў, што на допыце на яго ціснулі, запалохвалі, што на два месяцы адправяць у СІЗА, ён на той момант суткі не еў, сядзеў некалькі гадзінаў у кайданках, таму даў паказанні пад прымусам, сказаў няпраўду.

У судзе агучылі паказанні, якія Вячаслаў даваў у якасці падазраванага па справе: тады ён казаў, што бацька паказаў яму ўлёткі рознага зместу і прапанаваў пайсці ў горад, папрасіў глядзець за абстаноўкай, пакуль ён будзе ляпіць. Увечары мужчыны выйшлі з дома, спачатку бацька ляпіў улёткі, а сын — сачыў за сітуацыяй, пазней Генадзь прапанаваў Вячаславу дапамагчы яму расклейваць, і сын пагадзіўся.

Абвінавачваны растлумачыў, што месцы налепвання прыдумляў, зыходзячы з тых скрыншотаў, якія ўбачыў на стале ў следчага, баяўся міліцыі і ціску з іх боку.

Пацярпелы **Аляксандр Болтуць** распавёў суду, што 3 жніўня быў на выездзе з участковым інспектарам Гурыным, паступіла паведамленне пра тое, што два чалавекі распіваюць спіртныя напоі ў парку. Калі падышлі да Генадзя Смірнова і яго знаёмага, спіртных напояў пры іх не было, але адчуваўся пах алкаголю, прапанавалі прайсці ў машыну і праехаць на агляд, але грамадзяне адмовіліся. Каля 10 хвілін спрабавалі ўгаворваць, а пасля пацярпелы ўзяў Генадзя за руку, а той павярнуўся і яго пхнуў нямоцна — ударыў галавой шлем, пацярпелы болю не адчуваў. Пасля гэтага да абвінавачванага і яго знаёмага пачалі ўжываць фізічную сілу — заломліваць рукі за спіну, Смірноў пачаў вырывацца, тады яго паклалі на зямлю, хацелі надзець кайданкі, у гэты момант Генадзь нанёс удар нагой пацярпеламу па галаве: болю ён не адчуў, але на шлеме ўтварылася расколіна. Ніякіх патрабаванняў не заяўляў.

Апытаныя ў судзе сведкі-міліцыянеры паказалі суду, што Генадзь Смірноў аказваў супраціў пры затрыманні, а таксама, што падчас ператрусу дома ў абвінавачаных 18 сакавіка знайшлі падобныя ўлёткі ў кішэні ягонай курткі.

У другім судовым пасяджэнні ўдзельнічала абарона абвінавачваных, якая прасіла дапытаць абвінавачваных і сведак паўторна, бо адвакаты не ўдзельнічалі ад пачатку працэсу. Аднак суд адхіліў заяўленае хадайніцтва. Пасля даследаванняў пісьмовых доказаў адвакатка прасіла час для больш поўнага вывучэння матэрыялаў справы і падрыхтоўкі да спрэчак, але суддзя адмовіў у працягу судовага пасяджэння ў іншы дзень.

Падчас спрэчак бакоў пракурор сказаў, што, нягледзячы на непрызнанне абвінавачванымі сваёй віны, вінаватасць бацькі і сына Смірновых знайшла сваё пацверджанне падчас папярэдняга расследавання і судовага следства: Генадзь адмаўляўся ад дачы паказанняў, але Вячаслаў фактычна пацвердзіў распаўсюд разам з бацькам улётак з абразлівымі выказваннямі на адрас Лукашэнкі, а таксама апісаў размеркаванне роляў і месцы расклейвання. Прасіла суд прызнаць Генадзя Смірнова вінаватым у здзяйсненні злачынства паводле ч. 1 арт. 368 КК і прызначыць яму пакаранне ў выглядзе зняволення тэрмінам на адзін год, а таксама ў здзяйсненні злачынства паводле ч. 2 арт. 363 КК і прызначыць пакаранне ў выглядзе зняволення тэрмінам на два гады. **Канчаткова прызначыць Генадзю Смірнову шляхам частковага складання пакаранне ў выглядзе зняволення тэрмінам на два гады і шэсць месяцаў** з адбываннем пакарання ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

Таксама прызнаць вінаватым **Вячаслава Смірнова** ў здзяйсненні злачынства паводле ч. 1 арт. 368 КК і **прызначыць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на два гады**.

Менавіта такое пакаранне і прызначыла суддзя Таццяна Жарко.

Твитнуть







СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

